НЕ ПРА ПУХ

Не ведаю, як іншым, а мне дык вельмі падабаюцца рэчы з гісторыяй. Ну вось прыклад: у шафе ў мяне на самым пачэсным месцы ляжыць вялікая ажурная хустка, якую сваімі рукамі звязала мая бабуля і потым абхіналася, едучы з дзедам у госці ды на кірмашы. Побач з хусткай — яе ж, бабуліна, саматканая посцілка. Ні канапу, ні ложак ёй, на жаль, не засцелеш, бо вузкая, але і распароць на два палавікі для дачы рука не падымаецца — шкада. А вось саматканых льняных ручнікоў — не, бо яны чым болей мыюцца, тым больш мякчэюць і бялеюць. І татавымі драўлянымі лыжкамі я з радасцю карыстаюся. І пасцельнай бялізнай, што атрымала ў пасаг ад мамы. І...

Пералік дарагіх мне рэчаў можна доўжыць і доўжыць, але зараз я хачу расказаць пра адну, якую купіла... сама.

У тую восень непрыемнасці на маю галаву сыпаліся з усіх бакоў: я шукала і не магла знайсці сабе працу, праз гэта вельмі перажывала, хварэла, перасварылася са сваімі сямейнікамі... Да ўсяго недзе непадалёк ад дома перыядычна рвала трубы, і ў нашым доме пастаянна адключалі то гарачую ваду, то ацяпленне, то ўсё разам... Карацей, змрок быў амаль што поўны!

Каб хоць неяк ад яго ўратавацца, я ўключала музыку і яркае святло, мыла, гатавала, прыбірала, вязала доўгі чырвоны шалік.

А да яго зусім неспадзявана купіла... паліто, прычым... белае. Галоўнае — разумела, што грошай у хаце няма, што рэч гэтая зусім непрактычная, а тым больш у горадзе і на кожны дзень, але ж, праходзячы па рынку, убачыла, памерала і зняць ужо не змагла.

Дамачадцы мае, дзякаваць Богу, не папракалі, нават павіншавалі з абноўкай...

Я прыбралася і хоць трохі павесялела, бо ў новым пухавічку адчувала сябе і маладзейшай, і прыгажэйшай, і больш упэўненай. А галоўнае, што са мной па-іншаму сталі размаўляць працадаўцы: нешта раілі, абяцалі... Мне трэба было хіба пачакаць, а яшчэ — памыць (ніз хутка спэцкаўся) маё чароўнае паліто.

Справа гэта лёгкая: зашпіліла я ўсе кнопачкі-маланкі, вывернула рэч на благі бок, усыпала праверанымі часам пральны парашок і...

І назаўтра да ўсіх маіх непрыемнасцей дадалася яшчэ адна, бо пасля сушкі высветлілася, што ўвесь пух у маім новым паліто... збіўся ў ладныя камякі. Адпаведна і полы, і спінка, і рукавы сталі выглядаць, як заснежаная ралля — усё на ямах і грудках.

Думаеце, гэта не бяда: трэба проста вярнуць паліто прадаўцу?

Я вярнула б, але ж... Рэч я купіла на чужым, зусім незнаёмым рынку, у каго — хоць забі, не помню, ды і ніякага чэка ў мяне няма...

Муж тады праўду сказаў: маўляў, палову яго зарплаты я скруціла ў трубачку і сабаку пад хвост... Туды ж «прасілася» паліто. Але штосьці трымала: у найбліжэйшую суботу мы збіраліся на лецішча па гародніну. А ў нас там завядзёнка: усё непатрэбнае вешаем на плот — можа, забярэ хто з суседзяў альбо з вяскоўцаў, якія паўз дачы ходзяць у краму.

Я дык нават уяўляла ўжо, як паліто маё трапляе ў хату да нейкай майстрыхі, як яна «набівае» яго новым пухам або іншым уцяпляльнікам, аддае дачцэ ці ўнучцы...

Шмат, карацей, было думак, а толку — нуль, бо праз два тыдні, зноў заехаўшы на дачу, мы здалёк убачылі, што паліто па-ранейшаму вісіць — нікому не патрэбнае. Нават тут...

Было ад чаго засмуціцца!

А потым — і гэтак жа да слёз! — узрадавацца, бо, падышоўшы бліжэй, рэч сваю я проста не пазнала. Дзе падзеліся тыя бясформенныя камякі на полах, спіне і рукавах?! Паліто было акурат як новае: белае, роўнае, гладкае... Усё распушылася, грэе! А ўжо выглядае...

Менавіта ў ім, тым паліто (ды з чырвоным шалікам) я знайшла сабе новую працу, менавіта яго апранаю і цяпер, хаця б для таго, каб помніць, што многія нашы непрыемнасці, як тыя камякі, могуць разысціся, «рассмактацца» пад уздзеяннем свежага паветра, лёгкага марозіку і проста... часу.

Л. Ю.,

г. Гродна

РАЗВОД І... КУРЫ ПАПАЛАМ

Не так даўно на нашай вуліцы пасяліліся маладажоны — Люба і Пятро. На першых парах ціхутка жылі, бо, відаць, хавалі ўсё дрэннае, што было ў іх характарах, прывыкалі адно да аднаго. А ўжо потым... Можа, не прывыклі, а можа, зашмат было таго дрэннага, бо з іх хаты яно палезла як цеста з дзежкі.

Падчас сварак мы, суседзі, і дазналіся, што ў сужэнцаў гэты шлюб другі. Як Любашу паслухаць, дык яе першы муж «піў, біў і грошай не даваў». Як Пятра — дык яго былая хацела толькі смачна есці і нічога не рабіць.

Развяліся, карацей, наноў пажаніліся. І што ж нажылі?

Мы, прыгледзеўшыся да гэтай пары, прызналі, што Любе, можна сказаць, пашчасціла. Пятро, новы муж, грошай не прапіваў і нямала, відаць, зарабляў, бо пасадзіў жонку дома (трымаць парадак, займацца сабой ды сваімі хваробамі)... Да таго ж на падворку адразу паставіў цяпліцу, потым пабудаваў лазню і ладны хляўчук, завёў свінчо, накупляў курэй з куранятамі. Сам здабываў ім корм, сам варыў і насіў. Жонка зрэдку хіба якога збожжа насыпле альбо вады занясе — ленавалася кабета нават у краму па хлеб схадзіць. Казала мужу:

— Табе ён трэба, дык ты і ідзі. А я сваё мяса і так з'ем... Ад хлеба паўнеюць.

Карацей, не шанавала яна свайго чалавека, а многае з таго, што ён прыносіў, прывозіў ды зарабляў, употай перапраўляла сынку ад першага шлюбу.

Былі дзеці і ў Пятра, аднак іх, каб магла, Люба і на парог не пусціла б...

А гаспадар жа хацеў — і прывеціць іх, і пачаставаць, і пагаварыць...

Усё часцей здаралася: злаваўся ён на жонку — гарэлі нервы, і таму аднойчы пачаўся «пажар»: заявіў ён Любе:

— Усё, развод! Вунь Бог, а вунь парог... Я застаюся тут, у хаце, а ты ў кватэры жыві.

— Дудкі! — заявіла на гэта жонка. — Дурніцу знайшоў... Я пераеду і буду сядзець на нішчымніцы, а ты тут... маладую курацыну есці?

— Якую курацыну? Што ты вярзеш? — разгубіўся Пётр.

— А то не ведаеш: кураняты нашы выраслі? Выраслі. Я іх карміла? Карміла. Значыць, палова цяпер мая!

— Дык забірай яе ды каціся...

— А хто мне іх пасячэ, хто абскубе ды абсмаліць? Хто на кавалачкі потым парэжа? Наймаць некага буду? Не, галубок: я з гэтай хаты не пайду, пакуль пеўняў сваіх не з'ем!

...Так і засталася, жывуць, прынамсі пакуль: даядаюць пеўнікаў. Потым, магчыма, возьмуцца за парсючка, а потым будзе новая вясна і на падворку — новая жыўнасць.

Раіса Васілёва,

г. Гомель

САЕЧКА І СУХАРЫК,

альбо Два боты — пара?

Мянушку гэтаму нестарому яшчэ халасцяку прыдумалі на працы. Не, ён зусім не чэрствы быў! І не сухі (чалавек як чалавек), проста на жанчын не ласы. Вось тыя і празвалі яго не Сухаром — Сухарыкам. А ўжо колькі разоў спрабавалі ачмурыць! Нават стымул такі прыдумалі: хто яго «падчэпіць», атрымае скрыню шампанскага. Найбольш старалася Галя... Ды толькі марна ўсё — Сухарык ну ніяк не паддаваўся: паправіць свае акуляры, усміхнецца дзеля прыліку і далей «паплыў» — зрываецца «з кручка», хоць ты плач! Пакуль...

Неяк, у дзень народзінаў той Галіны, на працу да іх з вёскі заехала сваячка: удавіца, вясёлая, румяная, як той пірог! Гасцінцы з сабою везла: першачок, сала, квашаную капустачку... Імянінніца, убачыўшы гэта, тут жа арганізавала сабантуй: маўляў, колькі таго жыцця, а радасцей мала! Тым больш што заўтра — субота... У выніку многія з іх аддзела патэлефанавалі дадому, папярэдзілі, што затрымаюцца... А вось Сухарык сабраўся сыходзіць.

— Ты куды гэта? — строга спытала імянінніца.

— Мне дадому трэба.

— Пойдзеш пазней. А пакуль — я цябе не адпускаю. Заставайся.

Сухарык завагаўся быў, як маятнік, які толькі што падштурхнулі, аднак, падняўшы вочы на госцю і сустраўшы яе нябесна-блакітны позірк, падумаў: «Ат, была ні была...»

— Мяне завуць Дар'я, — сказала маладзіца, сядаючы побач і наліваючы яму першачку. — А вас чаму Сухарыкам клічуць?

— Не ведаю... Па пашпарце я — Саша.

— Ага, разумею. У нашай вёсцы таксама людзей па-рознаму клічуць: каго Цаглінай, каго — Аглобляй. Мяне вось Саечкай... Відаць, праз пышнасць? Ды я не крыўдую, няхай... Выпіце, Саша, і закусіце. Тут сваё ўсё, вясковае...

Не тое ад яе такога блізкага голасу, не тое ад самагонкі на душы ў Сухарыка пасвятлела і пацяплела. Ды і застольнікі ўжо расшумеліся, нават штосьці заспявалі. Праўда, галасы ў іх зусім не зліваліся, словы блыталіся. І Дар'я тады, цяжанька ўздыхнуўшы, ціха завяла: «Напілася я п'яна, не дайду я да дому...» Голас у яе быў незвычайны — нізкі, моцны, грудны. Ад яго ў Сухарыка аж мурашкі па спіне пабеглі.

— Вось гэта жанчына! З такой бы на прыроду, на тыдзень! — захоплена сказаў яму начальнік аддзела, тут жа «арганізаваў рытмічную музычку» і, вывеўшы маладзіцу ў сярэдзіну пакоя, закружыўся вакол, што той певень... Госця ля яго выглядала павачкай, але ж...

— Змарылася, — весела сказала Сухарыку, сядаючы пабач. — А вы чаму сумны?

— Таму што я ўсё жыццё чакаў такую жанчыну, як вы, а цяпер, калі сустрэў, павінен расстацца...

— Гэта чаму ж? — спытала Дар'я.

— Таму што вы заўтра ці калі там паедзеце ў сваю вёску, а я...

— Ну дык і вы паедзьце... У мяне там свой дом, сад з агародам, кароўка, свінкі. Сынок мой Ваня даўно просіць татку прывезці. Чацвёрты гадок малому...

— І вы прапануеце мне паехаць? Вось так адразу? — здзівіўся Сухарык. — Вы ж мяне зусім не ведаеце.

— Не ведаю ды бачу, што чалавек вы добры. А добрыя людзі на дарозе не валяюцца!

— Сапраўды, — згадзіўся Сухарык. — Хоць ад вашай самагонкі паваліцца і можна... Назаўтра, у суботу, Галіна праводзіла Дар'ю на вакзал. Чакаючы аўтобуса, яны ўспаміналі ўчарашнюю вечарынку, казалі, як жа ўсё было добра!

— Толькі Сухарык штосьці сумаваў. А ўжо сыходзіў, дык і зусім як хмара, — прызнала Галіна, пазіраючы на Дар'ю.

— Ой, глядзі, хто ідзе! — пачырванеўшы, усклікнула тая.

— Божухна, я не веру вачам! — здзівілася Галя.

З аднаго боку да іх падыходзіў аўтобус, а з другога — Сухарык.

— Вось... Праводзіць прыйшоў, — збянтэжана сказаў ён.

— Гэта добра!.. Ну, дык шчасліва заставацца? — Дар'я працягнула яму руку.

— Бывайце, — сумна ўсміхнуўся той.

...Аўтобус крануўся з месца і ўжо трохі ад'ехаў, калі Сухарык з крыкам «Стой!» кінуўся яму ўслед.

Кіроўца досыць рэзка затармазіў, адчыніў дзверы. Сухарык уляцеў у салон і сеў поруч з Дар'яй.

Усё адбылося настолькі нечакана, што ніхто нічога не зразумеў. Хіба Галіна:

— Ай ды Сухарык! Ай ды малайчына!.. І ты малайчынка, Дар'я! Я прыеду да вас... Прыеду са скрыняй шампанскага!

— А навошта скрыня? — гучна спытала маладзіца.

— Ды ў нас дамова такая! — паспела крыкнуць Галіна.

Аўтобус, пакінуўшы лёгкую аблачынку дыму, хутка паімчаў у далячынь, звозячы ў вёску Дар'ю, Сухарыка ды іх нечаканае шчасце.

Валянціна Паліканіна,

г. Мінск

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

dounar@zviazda.by

Ад яе ж: *ведаеце, што аб'ядноўвае гэтыя гісторыі? Тое, што кожная з іх пачыналася словамі: «Я даўно збіралася расказаць вам пра тое...»*

Дык, калі ласка, не «збірайцеся» — расказвайце!



Скажы, сіноптык, што мяне чакае.
Ці снег з дажджом, ці, можа, дождж са снегам?
Ці галалёд — вось гэта не да смеху:
Я галалёд «балюча успрымаю».

Паабяцай, сіноптык, мне парошу —
На чыстым аркушы пачну нанова.
Нанова сцежкі, стрэчы, мары, словы...
Хачу, каб снежань пушчы упрыгожыў.

Паабяцай усім святым і грэшным,
Што прэч прагоняць завіруху злую.
Калі ж прагноз не спраўдзіцца — дарую:
Я ж марна сам вясну шукаю ў снежні.

ДЛЯ ЗВАРОТАЎ ZVAROT@ZVIAZDA.BY

■ Пасля пісьма

«ЗВЯЗДА» — ГЭТА НАША, БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА!

«У Беларусі дзве дзяржаўныя мовы. «Звязда» — адзіная штодзённая газета, якая выходзіць на першай. У яе эпіграфе так і значыцца: родная, на роднай мове. Але ж я, колькі ні шукаў у слоўніках, не знайшоў там такога беларускага слова, — піша ў рэдакцыю ***спадар Міхаіл Буйніч з Гомеля.*** *— Ды і нашы класікі, наколькі ведаю, пісалі пра зоры, зорачкі, заранкі... Тады адкуль узялася «Звязда»? Трэба разумець, ад рускага «звезда» толькі з памылкай? Прабачце, але гэта нагадала мне ўбачанае на адным з нашых шапікаў слова «цвяты»...*

І яшчэ. Калі газета сапраўды беларускамоўная, то чаму на рускай мове ў ёй падаецца рэклама? — пытаецца чытач. — Чаму на ёй жа друкуецца дадатак «Союз Евразия»? Дарэчы, якраз у ім не так даўно быў артыкул Надзеі Юшкевіч «Сохранить чистоту «великого и могучего». У ім паведамлялася пра тое, што прадстаўнікі 15 дзяржаў з'язджаліся ў Мінск, каб абмеркаваць праблемы захавання рускай мовы... Вось дзе прыклад клопату, у тым ліку для нас, беларусаў! Хоць, як на мой погляд, дык рускай мове ў нашай краіне нішто не пагражае. А вось беларускую трэба падтрымліваць і захоўваць. Ці не так?»

Каб адказаць на ўзнятыя ў гэтым лісце пытанні, спецыяльна для спадара Буйніча ды магчыма, іншых адносна новых чытачоў нашай газеты адкрыем «Беларускую энцыклапедыю» (Мінск, 1998 г., т. 7). Паводле яе, «Звязда» — гэта, па-першае, **штодзённая грамадска-палітычная газета, якая выходзіць з 1917 года...** А па другое — **рухомая шматпрамянёвая асветленая знутры зорка на кіі, з якой хадзілі так званыя звездары, атрыбут каляднай абраднасці.**

Далей у артыкуле ідзе досыць падрабязны расказ пра тое, з чаго і як ён, гэты атрыбут, рабіўся, чым упрыгожваўся. Дадаецца таксама дакумент — фатаграфія хлопчыка з вёскі Капылы Камянецкага раёна з гатовым вырабам, адзначаецца (падкрэслім — у энцыклапедыі!), што здымак зроблены ў 40-я гады, а наогул, звычай нашэння **звязды** быў пашыраны да 20-30-х гадоў мінулага стагоддзя.

Тады, трэба разумець, само гэтае слова сумненняў не выклікала. Але ж у многіх яно не выклікае іх і цяпер, бо яны яшчэ памятаюць гэты калядны абрад, удзельнічалі ў ім самі альбо чулі ад сваіх бацькоў.

Больш за тое, у многіх куточках краіны падчас Каляд **звёзды**, як сімвал сонца, па-ранейшаму «загараюцца»! Ахвотныя пераапранаюцца ў «мядзведзя», «казу» і «жорава», ходзяць па хатах і кватэрах — віншуюць гаспадароў, спяваюць жартоўныя песні, частуюцца, варожаць, гуляюць у «жаніцьбу Цярэшкі»...

Жывая традыцыя, жывое слова, у тым ліку, магчыма, дзякуючы самому факту існавання газеты.

...Што тычыцца дадатку «Союз Евразия», то дзякуючы яму «Звязду» (у тым ліку ў электронным выглядзе) усё актыўней пачынаюць чытаць у тым самым Саюзе — у Расіі, Казахстане, Арменіі, Кыргызстане... Чытаюць на зразумелай у гэтых краінах рускай мове, мове міжнацыянальных зносінаў, што, дарэчы, дазваляе рэдакцыі эканоміць на перакладах — з беларускай на тую ж, напрыклад, армянскую, казахскую і г.д.

З той жа прычыны пераважна на другой з дзяржаўных моў друкуецца і рэклама.

Асобныя з чытачоў прапануюць (а то і настойваюць!) зменшыць яе аб'ёмы. Ды што там — нават зусім адмовіцца... Але ж гэта пакуль немагчыма. Хаця б таму, што тады давялося б павышаць кошт падпіскі і, адпаведна — страчваць пастаянных чытачоў. «Звязда» ж наадварот — зацікаўлена ў тым, каб іх было болей!

А таму падчас чарговай падпісной кампаніі мы, яе супрацоўнікі, па-ранейшаму спадзяёмся не толькі на паштальёнаў ды грамадскіх распаўсюджвальнікаў, мы спадзяёмся на нашых шчырых прыхільнікаў. Калі вам неабыякавы лёс роднай мовы, лёс газеты, якую з нецярпеннем чакалі і чыталі (нават у гады вайны!) вашы дзяды і прадзеды, калі яе ж чытаеце і паважаеце вы, калі ласка, прапагандуйце — райце яе сваім суседзям, сябрам, супрацоўнікам, давайце пачытаць...

Тады, магчыма, у «Звязды» стане больш падпісчыкаў, шырэй загучыць яе назва, вернецца ў шырокі ўжытак само гэтае слова — звязда!

І ні ў кога не застанецца сумненняў наконт таго, беларускае яно ці не. Беларускае... З энцыклапедыяй (паводле слоўніка, навуковым даведачным выданнем) не паспрачаешся.

Аддзел пісьмаў

ДЛЯ ЗВАРОТАЎ ZVAROT@ZVIAZDA.BY

■ Каб помнілі...

ЖЫЦЦЁ ЯК ПРЫКЛАД ДЛЯ ІНШЫХ

Паміж датамі яго нараджэння (21.09.1923) і смерці (25.10.2015) — не маленькая рысачка, а вялікае жыццё на карысць Айчыне. У няпоўныя 46 гадоў Мікалай Аляксандравіч быў абраны прэзідэнтам Акадэміі навук БССР і ўзначальваў яе ажно 18 гадоў. Ён — аўтар сотняў навуковых прац і некалькіх манаграфій. Што датычыцца ўзнагарод, то іх у Мікалая Барысевіча хапіла б на цэлы калектыў: Герой Сацыялістычнай Працы, кавалер чатырох ордэнаў Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Францыска Скарыны, лаўрэат прэстыжных прэмій... Акадэмія навук Беларусі пад кіраўніцтвам Барысевіча стала адным з найбуйнейшых навуковых цэнтраў былога СССР, яе аўтарытэт прызналі ва ўсім свеце.



А нарадзіўся будучы акадэмік у звычайнай сялянскай сям'і, у вёсцы Лучны Мост, якую самі месцічы звалі Барысы, бо там шмат было Барысевічаў.

Мікалай змалку хадзіў у калгас на працу, вельмі любіў даглядаць коней, але ж галоўнае — як сланечнік да сонца, цягнуўся да вучобы. Школу ён скончыў на выдатна: 18 чэрвеня 1941 года атрымаў атэстат, марыў паступіць на фізіка-матэматычны факультэт універсітэта... А праз 4 дні пачалася вайна і «паступіць» яму давялося... у падпольную групу, потым — паслужыць у 539-м артылерыйскім палку.

Дарэчы, камандзір яго пры дэмабілізацыі згледзеў, які парваны шынель у пераможцы — салдата Барысевіча, і аддаў загад уручыць яму свой, генеральскі (зняўшы, вядома ж, пагоны).

Дарагі падарунак, дарагая рэч, і новаму гаспадару яна паслужыла і добра, і доўга. Пасля вайны Мікалай усё ж стаў студэнтам фізіка-матэматычнага факультэта БДУ, і, як расказваў, спачатку з усімі сваімі пажыткамі, што змяшчаліся ў салдацкім рэчмяшку, начаваў на вакзале. Потым ужо засяліўся ў невялічкі інтэрнацкі пакойчык. І спаў там на стале, накрываючыся тым афіцэрскім шынялём.

Школьных ведаў хлопцу яўна не хапала, і ён пры святле газоўкі, зробленай з гільзы, начамі сядзеў над бібліятэчнымі кнігамі. Стаў адным з найлепшых студэнтаў, потым — аспірантам, кандыдатам, доктарам фізіка-матэматычных навук. «Выйшаў у людзі», — казаў пра яго бацька, але сын пры гэтым заставаўся простым чалавекам.

Яшчэ ў юнацтве стрыечны брат навучыў Мікалая ігры на гітары. Скрыпку ён асвоіў самастойна і на фронце насіў яе ў рэчмяшку за плячыма. Пасля вайны іграў на студэнцкіх вячорках, на сямейных святах, з музыкай любіў адпачываць. Яна дапамагала яму захоўваць душэўную раўнавагу, успамінаць мілую сэрцу вёску.

...Памятаю, як напярэдадні свайго юбілею шаноўны зямляк разам з жонкай наведаў нашу раённую бібліятэку. Падчас той сустрэчы, дэманструючы выключную інтэлігентнасць, шчырасць і любоў да людзей, акадэмік успамінаў цікавыя выпадкі з жыцця, расказваў пра сваіх дзяцей, унукаў... Бясспрэчна, Мікалай Аляксандравіч пражыў доўгае і годнае жыццё, пакінуў пра сябе цудоўную памяць, бо імя яго ведаюць ва ўсім свеце.

І вельмі хочацца, каб яно захавалася. У прыватнасці, каб Мікалай Барысевіч атрымаў званне ганаровага грамадзяніна Беразіно, каб адной з вуліц і, напрыклад, гарадской школе №1, дзе ён да вайны вучыўся (цяпер, дарэчы, гэта гімназія), было прысвоена імя вось такога выпускніка...

Гэта быў бы добры прыклад для іншых.

Тамара КРУТАЛЕВІЧ,
загадчыца аддзела маркетынгу Бярэзінскай цэнтральнай бібліятэкі

ДЛЯ ЗВАРОТАЎ ZVAROT@ZVIAZDA.BY

■ Чалавек — чалавеку

ЦІ МОГУЦЬ ЛЮДЗІ БЫЦЬ АНЁЛАМІ?

Вы скажаце — не... А я скажу, што так, бо да нас у «Зубраня» прыязджалі супрацоўнікі пошукава-выратавальнага атрада «Анёл».

Заснаваў яго Сяргей Коўган 15 чэрвеня 2012 года, і займаецца атрад пошукам зніклых людзей.

Аляксандр Квяткоўскі — каардынатар гарадскога пошуку. Ён працуе з інфармацыяй, разам з камандай валанцёраў тэлефануе ў бальніцы і моргі, шукае сведак, апытвае сваякоў, размяшчае інфармацыю аб зніклых на сайце, у сацыяльных сетках, СМІ, расклейвае арыенцірокі...

«Анёл» супрацоўнічае з «Tut.by», «Onliner», «Зонай Х». Толькі дзякуючы рэпостам у сацыяльных сетках за год знаходзяць больш за 200 чалавек.

Каб зрабіць пошук хутчэйшым, у больш чым 20 гарадах краіны працуюць прадстаўнікі «Анёла». Далучыцца да іх можа любы ахвотны. Адзіная ўмова — узрост: каб працаваць у лесе, трэба быць старэйшым за 18 гадоў.

Крысціна Басава — каардынатар менавіта лясных пошукаў. Яна сама ў чэрвені 2013 года шукала свайго сваяка. Знайшлі яго толькі ў кастрычніку і, на жаль, загінулым... Пасля гэтага дзяўчына стала валанцёрам. Ёй хочацца дапамагаць людзям і чуць ад іх слова «дзякуй». Дарэчы, Крысціна ў гэтым плане выключэнне: амаль усе, хто звяртаўся па дапамогу да «Анёла», больш не працавалі з ім. Магчыма, не хацелі ўспамінаць бяду, якую давялося перажыць...

А прычыны ў яе самыя розныя, і ў залежнасці ад іх ёсць некалькі метадаў пошуку людзей. Як расказала Крысціна, галоўны рэсурс «анёлаў» — час: вельмі важна, каб блізкія зніклых звярталіся па дапамогу адразу, а не праз 3 сутак... Знайсці чалавека па гарачых слядах лягчэй.

Бывае, што даводзіцца шукаць нежывых. Найчасцей гэта робяць вадалазы.

На пытанне, чаму ён выбраў такую складаную працу, Дзмітрый Асмалоўскі адказаў, што душой прыкіпеў да мора: нейкі час працаваў на Каспійскім і Чорным, потым стаў вадалазам у Беларусі...

У Сяргея Коўгана, Крысціны Басавай, Аляксандра Квяткоўскага, Дзмітрыя Асмалоўскага ды іншых — свае сем'і, свае клопаты. Аднак яны не перашкаджаюць «анёлам» знаходзіць час, каб дапамагаць іншым. Часам — рызыкуючы жыццём і нічога не чакаючы, не просячы ўзамен. Дык такія вось альтруісты хіба не анёлы?

Каб стаць адным з іх, як кажа Крысціна Басава, дастаткова жадання.

Паліна ЗАБЕЛА

■ Рэзананс

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ. ЦІ ЎСЁ Ж НЕ ВЕЛЬМІ?..

Газету «Звязда» я выпісваю даўно і — прынцыпова — з-за мовы, бо добра ведаю: калі на ёй не чытаць, не пісаць і не размаўляць, яна забудзецца, страціцца назусім...

Так сталася, напрыклад, з маёй англійскай. Пасля школы, а потым інстытута я досыць добра ведала яе, але прайшоў час, і ў памяці засталіся хіба сотня-другая слоў. Для таго, каб тое ж не адбылося з роднай, я пастаянна чытаю «Звязду» і беларускія кнігі (па магчымасці набываю новыя, у тым ліку маладых аўтараў), слухаю радыё, хоць не заўсёды, але ж стараюся глядзець перадачу «Размаўляем па-беларуску».

У адным з нядаўніх выпускаў камандзе паказалі малюнак, на якім былі нейкія сукенкі, спадніцы, кашулькі, і папрасілі сказаць (вядома ж, па-беларуску), што гэта? «Вопратка», — амаль адразу ж прызналі гульцы. «Гэта — правільны адказ», — згадзілася вядучая. І ніхто яе не паправіў, хоць на мой погляд зрабіць гэта варта было, бо, наколькі ведаю (і тлумачальны слоўнік так піша), **вопратка** — менавіта *верхняе* адзенне. І якраз яно *апранаецца*, а сукенкі, спаднічкі ды іншае **адзенне** — *надзяваецца*...

...Напярэдадні зімы без *вопраткі*, вядома ж, ніяк. Аднак яшчэ продкі заўважалі, што без кашулі і кажух не грэе. Гэта значыць, што вопратка вопраткай, але *адзенне* мусіць быць таксама.

А. СВІРЫДОВІЧ